Слова для Жыцця (116)

Аўтар: Рэдакцыя
15.05.2016 00:00



Папа Францішак

Мы не адныя: Езус знаходзіцца побач з намі, сярод нас, у нас! Яго новая прысутнасць у гісторыі рэалізуецца праз дар Святога Духа, дзякуючы якому можна наладзіць жывую сувязь з Ім – Укрыжаваным і Уваскрослым. Дух, які разліваецца ў нас праз сакраманты хросту і канфірмацыі, дзейнічае ў нашым жыцці. Ён кіруе намі ў спосабе мыслення і дзеяння, каб мы адрозніваліі добрае ад дрэннага. Дапамагае практыкаваць любоў Езуса, Яго аддаванне сябе іншым, асабліва тым, хто найбольш гэтага патрабуе.

Знакам прысутнасці Святога Духа з'яўляецца супакой, які Езус дае сваім вучням: "Супакой Мой даю вам" (27). Ён вынікае з перамогі над грахом, эгаізмам, які не дазваляе нам любіць адзін аднаго, як браты. Гэта дар Бога і знак Яго прысутнасці. Кожны вучань, закліканы сёння накіроўвацца за Езусам, несучы крыж, атрымлівае ў сэрцы супакой уваскрослага Хрыста разам з гарантыяй Яго перамогі, чакаючы Яго канчатковага прыходу.

"Regina Caeli" са Святым Айцом, 01.05.2016 †



Кс. абп Тадэвуш Кандрусевіч

Кожны дзень мы змагаемся з няпэўнасцю, канфліктамі і спакусамі. І толькі сталая

прысутнасць Бога дапамагае нам ісці ў будучыню з высока паднятай галавой, з надзеяй і хрысціянскай адвагай. Святы Дух дапамагае нам вярнуцца да крыніц нашай веры – Святога Пісання і Традыцыі – з мэтай падтрымкі і падбадзёрвання. Ён дапамагае пазнаць Божую праўду і адорвае сваім супакоем. Але каб атрымаць гэтыя дары, неабходна прабываць з Богам у малітве і слухацца Яго, каб зразумець Божыя планы адносна нас.

Праз Святога Духа Езус знаходзіцца з намі, не пакідае нас адных. Ён раздзяляе з кожным сваю радасць і ў сваёй міласэрнасці ператварае нашу грахоўную залежнасць у свабоду жыцця ў Божай ласцы. Але каб гэта адбылося, неабходна дазволіць Яму ўвайсці ў наша жыццё. Ён паважае нашу свабоду і таму нікога ні да чаго не змушае. Усё залежыць толькі ад нас саміх.

Фрагмент гамілii, прамоўленай у VI Велікодную нядзелю